**Няхай М.В.**, *дацэнт*

# АБ ПАШЫРАНАЙ ТРАКТОЎЦЫ ГІСТАРЫЧНАЙ ТЭМЫ Ў РАМАНЕ

Да нядаўняга часу існаваў скептычны погляд на магчымасць устанаўлення жанравых межаў беларускага гістарычнага рамана, усяляк падкрэслівалася нязначнасць яго дасягненняў, нежыццяздольнасць. Забывалася, што паняцце «гістарычны раман» зборнае, што за ім стаяць шматлікія жанравыя ўтварэнні. У ім вылучаюцца тры асноўныя блокі - уласна гістарычны раман, гісторыка-рэвалюцыйны і гісторыка-біяграфічны (да яго далучаецца і аўтабіяграфічны). Вельмі часта ўзнікае гаворка аб ваенна-гістарычным, гісторыка-бытавым, гісторыка-культурным, гісторыка-сучасным рамане. Існуе мноства жанрава-стылёвых разнавіднасцей, якія прыняты ў класіфікацыях сусветнай раманістыкі. Дык хіба гэта «чыстае» жанравае ўтварэнне, а не ўскладнёны жанравы «гібрыд»? Тут тоіцца сакрэт існавання гісторыка-літаратурнай канцэпцыі, згодна з якой

гістарычны раман у беларускай літаратуры быццам бы развіты слаба, а ў 20-30-я гады і ў першы пасляваенны перыяд зусім адсутнічаў. Наколькі адпавядае рэальнасці такая думка? Цяпер ёсць магчымасць усебакова ўзважыць значэнне твораў на гістарычную тэму, выкарыстаць больш прадуктыўныя метадалагічныя падыходы, якія здольны даць аб'ектыўны малюнак літаратурнага руху эпохі. Відавочна, што толькі цяпер у нашай літаратуры адраджаецца ўласна гістарычны раман, прадаўжаючы традыцыі У.Караткевіча (І.Шамякін, Э.Скобелеў, К.Тарасаў, Э.Ялугін, Л.Дайнека, Т.Бондар, В.Іпатава, В.Чаропка, У.Арлоў, В.Говар). Нядаўна паявіліся першыя спробы аўтабіяграфічнага рамана (А.Лойка, В.Коўтун, Я.Радкевіч, Я.Міклашэўскі), ідуць плённыя пошукі ў галіне аўтабіяграфічнай прозы (цыкл аповесцей пра дзяцінства, падлеткавыя гады і юнацтва І.Навуменкі).

У 20-50-я гады вядучае месца ў нас займаў гісторыка-рэвалюцыйны раман, які навука адносіла да паўгістарычных. Гэта тлумачылася не толькі тым, што падзеі, якія былі ў аснове такіх твораў, і пісьменнікамі, і чытачамі ўспрымаліся як сучасныя, а і тым, што матэрыял іх на той час яшчэ не стаў пройдзеным шляхам. Гісторыка-рэвалюцыйны раман савецкіх гадоў адлюстроўваў перыяд, які не быў «закрыты», «перажыты» і вычарпаны да канца ў практычнай дзейнасці людзей, не стаў мінулым у непасрэдным сэнсе гэтага слова. Цяпер такое патрабаванне знята, бо сітуацыя змянілася: раманы аб рэвалюцыі і грамадзянскай вайне ахопліваюць завершаны перыяд гісторыі. Яны перастаюць лічыцца паўгістарычнымі і па праву набываюць у нашай літаратуры месца паўнацэннага гістарычнага рамана. Вось чаму менавіта цяпер настаў час для больш паглыбленага літаратуразнаўчага даследавання гісторыка-рэвалюцыйнага рамана як разнавіднасці гістарычнага жанру. У яго сферы ў 20-30-я гады працавалі Ц.Гартны, М.Зарэцкі, М.Гарэцкі, К.Чорны, Я.Нёманскі, П.Галавач, Р.Мурашка, С.Баранавых, Э.Самуйлёнак, М.Паслядовіч, А.Чарнышэвіч, П.Пестрак і іншыя пісьменнікі.

Набліжаюцца да гістарычных твораў раманы аб калектывізацыі, аб вайне, раманы, прысвечаныя савецкім гадам. Але паколькі «вясковы» і «ваенны» раманы набылі ў нас



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шырокую распаўсюджанасць і сілу, то навука справядліва палічыла мэтазгодным разглядаць іх самастойна. Да таго ж, у творах аб вёсцы і вайне, аб вытворчасці заўсёды прысутнічала гістарычная тэма ў форме экскурсаў у мінулае герояў.

Гістарычныя матывы вельмі моцна адчуваюцца ў раманах аб сучаснасці, якія ўзніклі ў апошнія гады (А.Асіпенка, П.Місько, В.Супрунчук, М.Кусянкоў і іншыя). Усё больш выразна пад пяром сучасных раманістаў розныя часы выступаюць у сваёй найбольш адказнай якасці - гістарычнай.

Калі раней маральна-філасофская тэматыка такой жанравай разнавіднасці, як гістарычны раман, ажыццяўлялася не столькі ў рэалістычнай трактоўцы падзей і фактаў, колькі ў аднабаковым іх выбары (дасавецкая гісторыя не прызнавалася), то цяпер становішча змянілася. Адбываецца плённае і інтэнсіўнае ўзбагачэнне і абнаўленне ідэй і форм гістарычнага рамана, эстэтычна акрэсліваюцца жанравыя разнавіднасці трох яго асноўных іпастасяў - уласна гістарычнага, гісторыка-рэвалюцыйнага і гісторыка-біяграфічнага (аўтабіяграфічнага) рамана. Сэнс, які ўкладваецца ў яго цяпер, дае магчымасць якасна па-новаму падыходзіць да з'яў літаратуры, даследаваць яе эстэтычны матэрыял з улікам грамадска-палітычнага, ідэалагічнага і культурна-гістарычнага пунктаў гледжання, са спасылкай на агульнае становішча, светапоглядныя пазіцыі, у залежнасці ад якіх у першую чаргу і вырашаецца праблема тыпу і выбару жанравых форм, а таксама дасягаецца поўная ідэйна-эмацыянальная афарбаванасць мастацкіх твораў, іх унутраны пафас.

Найбольш значныя ідэйна-мастацкія адкрыцці ў гістарычным рамане зараз так ці інакш сумяшчаюць у сабе вобразы мінулага і сучаснасці. Беларускія пісьменнікі добра разумеюць, што праблемы гісторыі арганічна звязаны з праблемамі сучаснасці. Таму тэма мінулага не толькі інтэнсіўна адлюстроўваецца ў гістарычных раманах розных напрамкаў, а і непазбежна ўплятаецца ў адлюстраванне сучаснага жыцця. Пласты мінулага і сучаснага так шчыльна зрастаюцца, што цяжка бывае вылучыць той або другі. Становіцца зразумелым, што кожная тэма шукае зараз двайнога, а то і трайнога павароту для лепшага разумення логікі і мэты яе даследавання.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ